**УДК 655.11 (476) (043)**

# КНІГАВЫДАВЕЦКАЯ СПРАВА БССР У 1920 – 1930-я ГАДЫ

***А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Разгледжана станаўленне, развіццё і перабудова кнігавыдавецкай справы БССР у 1920 – 30-я гады, у адпаведнасці з задачамі, пастаўленымі савецкім кіраўніцтвам.*

Рэжым, які пачаў усталёўвацца ў краіне пасля кастрычніцкіх падзей, закрануў усе сферы жыццядзейнасці былой Расійскай Імперыіі. Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў грамадстве змянілі, адпаведна, і характар кнігавыдавецкай справы. Клопат аб прыбытку адыйшоў на другі план, а на першы – ступень ідэалагічнага ўздзеяння. Менавіта ад правільнай пастаноўкі выдавецкай справы залежала, як насельніцтва будзе ўспрымаць тыя ці іншыя эканамічныя і культурныя працэсы, ініцыятарамі якіх былі бальшавікі. Ад кнігавыдавецтва патрабавалася не толькі адлюстроўваць пры дапамозе друкаванага слова асаблівасці сацыяльна-культурнага развіцця грамадства, але як мага больш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці кнігі пры вырашэнні пастаўленай перад ім мэты – стварыць адпаведную цэласную сістэму ідэй, духоўных каштоўнасцей і выхоўваць народ у духу адзінага светапогляду.

Першым крокам было стварэнне адпаведнай сістэмы дзяржаўных органаў, пры якіх кіраўніцтва кнігавыдавецтва цалкам сканцэнтравалася б у руках дзяржавы як у цэнтры, так і на месцах. Пасля ўстанаўлення кантролю над папяровымі рэсурсамі і нацыяналізацыі друкарняў прадстаўнікі ўлады набылі выключнае права накіроўваць кнігавыдавецкую справу ў патрэбнае рэчышча. Асноўнымі выдавецтвамі прабальшавіцкага накірунку на тэрыторыі Беларусі з 1917 году былі «Звязда», выдавецкі пададдзел Наркамата асветы Савета Народных Камісараў Аблвыканкамзаха, літаратурна-выдавецкі аддзел Наркамата асветы БССР.

Развіццё кнігавыдавецкай справы ў БССР адбывалася ў надзвычай складаных умовах. Ваенныя дзеянні пад час польска-савецкай войны прывялі кнігавыдавецтва фактычна ў заняпад. Наладзіць яго ва ўмовах эканамічнай разрухі на тэрыторыі 6 паветаў было амаль немагчыма (тэрыторыя БССР да 1924 года ўключала толькі шэсць паветаў былой Мінскай губерні: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, з 1924 года – Чэрвеньскі, Мазырскі, Мінскі, Слуцкі, астатнія беларускія землі, па палітычных меркаваннях расійскага кіраўніцтва, былі далучаны ў 1919 годзе да РСФСР). Не хапала ні сродкаў, ні дастатковага матэрыяльнага забеспячэння. Значная частка друкаванай прадукцыі (пераважна газеты і агітацыйная літаратура) была прывезена ў Беларусь з Расіі.

1 студзеня 1921 года ў Мінску распачало сваю працу Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі на правах абласнога аддзялення Дзяржвыдавецтва РСФСР, з якім яно павінна было абвязкова ўзгадняць сваю дзейнасць [1, с. 35]. Характар выдавецтва вызначыў адказ ЦБ КП(б)Б ад 2 лютага 1921 года на просьбу аб карыстанні ім яўрэйскай партыяй Паалей-Цыён: «Дзяржаўнае выдавецтва з’яўляецца органам камуністычнай прапаганды і займаецца толькі камуністычнай агітацыйна-прапагандысцкай працай» [2, с. 154]. Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі павінна было забяспечваць друкаванай прадукцыяй не толькі тэрыторыю тагачаснай БССР, але і беларускія губерні ў складзе РСФСР (Віцебскую, Гомельскую, Смаленскую). Акрамя гэтага, бралася пад увагу тое, што на Каўказе, у Сібіры, Туркестане, Украіне знаходзілася значная колькасць беларусаў-перасяленцаў і бежанцаў, якія пакінулі краіну пад час першай сусветнай і польска-савецкай войнаў і таксама мелі патрэбу ў друкаванай беларускай прадукцыі. Аднак па тэхнічных прычынах забяспечыць насельніцтва, навучальныя ўстановы, бібліятэкі неабходнай літаратурай, асабліва на беларускай мове, выдавецтва не магло.

Савецкае кіраўніцтва баялася, што няздольнасць наладзіць выпуск беларускіх кніг выклікае незадавальненне з боку насельніцтва і дасць магчымасць іх палітычным праціўнікам абвінаваціць урад у тым, што прапагандаванне свабоднага культурнага развіцця ўсіх народаў застаецца толькі на паперы. Напрыклад, пад час польскай акупацыі з 17 мая па 15 ліпеня 1920 году было надрукавана 11 кніг, у той час як пры савецкай уладзе з 15 ліпеня па 1 лютага – тры кнігі [3, ф. 238, воп. 1, спр. 11, л. 1]. У некаторых выпадках насельніцтва сваімі сіламі спрабавала вырашыць праблему адсутнасці беларускамоўнай друкаванай прадукцыі. Так, у раёне акупацыі Люцыяна Жалігоўскага па ініцыятыве настаўнікаў і сялян (галоўным чынам католікаў) на ўласныя сродкі была адкрыта беларуская школа і распачата праца па выданню падручнікаў [3, ф. 42, воп. 1, спр. 66, л. 54].

Улада хацела зрабіць Мінск спачатку культурным, а потым і палітычным цэнтрам прыцяжэння для насельніцтва акупіраваных раёнаў. Таму, каб вырашыць праблему недахопу кніжнай прадукцыі на беларускай мове, цэнтральнае кіраўніцтва падтрымала прапанову беларускіх органаў аб выкарыстанні друку за межамі краіны (тым больш, што ўжо дзейнічалі падобныя выдавецтвы на яўрэйскай мове). Дзеля гэтай мэты СНК РСФСР выдзеліў Беларусі 20 мільёнаў рублёў золатам [3, ф. 42, воп. 1, спр. 66, л. 97]. Беларускі аддзел Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР быў створаны ў Берліне, які на той час быў цэнтрам культурнага жыцця рускага замежжа і адрозніваўся нізкімі коштамі і высокай тэхнічнай пастаноўкай кнігавыдавецкай справы. Са жніўня 1921 па май 1922 году аддзел выпусціў дзесяць кніг агульным тыражом 138,5 тысяч экзэмпляраў [4, с. 206]. Аднак значная інфляцыя, пры якой курс царскага рубля на замежным рынку ўпаў у параўнанні з вясновым курсам 1921 году больш чым у дзесяць разоў, не дазволіла цалкам ажыццявіць план. Афіцыйна гэта было галоўнай прычынай ліквідацыі беларускага аддзела ў Берліне. На самой справе ўсе існуючыя выдавецкія аддзяленні (у тым ліку і беларускі) былі ліквідаваны пасля таго, як у кастрычніку 1922 году выйшла пастанова СНК РСФСР аб забароне адкрываць за мяжой якія-небудзь выдавецкія аддзяленні ўсім дзяржаўным установам і прадпрыемствам [5, с. 32]. Гэта тлумачылася тым, што «издательства отклонились от реализации первоначального плана и к подбору книг перестали подходить с присущей ранее принципиальностью» [6, с. 203].

Новая эканамічная палітыка і неабходнасць пераходу на гаспадарчы разлік унеслі істотныя змены ў выдавецкую дзейнасць. Пачалі аднаўляцца прыватныя выдавецкія прадпрыемствы. Аднак у БССР гэты працэс не набыў такіх значных памераў, як, напрыклад, у РСФСР. У Мінску дзейнічала толькі 5 прыватных прадпрыемстваў з колькасцю працоўных да 60 чалавек [3, ф. 63, воп. 1, спр. 796, л. 270]. Астатнія адносіліся да дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Аднак нават ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі ў кнігавыдавецкай справе назіралася дзікая сумесь элементаў рынку і дзяржаўнага кіравання. Праводзілася цвёрдая палітыка адносна ўстанаўлення цэн на друкаваную прадукцыю, распараджэння папяровымі рэсурсамі, укараняўся планавы пачатак.

Сярод кааператыўных выдавецтваў БССР найбольш паспяховым было «Адраджэнне», заснаванае ў красавіку 1922 году па ініцыятыве Акадэмічнага цэнтра Наркамасветы БССР з мэтай выдання твораў мастацкай літаратуры і падручнікаў для беларускіх школ (праз некаторы час рэарганізаванае ў выдавецтва «Савецкая Беларусь»). Аднак той факт, што яно з'яўлялася моцным канкурэнтам у выдавецкай і камерцыйнай дзейнасці ў адносінах да выдавецтваў, якія знаходзіліся пад апекай партыйных органаў, не задавальняла кіраўніцтва КП(б)Б. Таму ў верасні 1924 года «Савецкая Беларусь» і Белтрэстдрук былі злучаны ў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (БДВ), якое аб'яднала выдавецкую, паліграфічную і камерцыйную дзейнасць [3, ф. 42, воп. 1, спр. 318, л. 105]. Кіраўніком быў прызначаны З. Жылуновіч, а выдавецкі сектар узначаліў І. Цвікевіч. Менавіта на БДВ ва ўмовах разгортвання беларусізацыі было ўскладзена вырашэнне праблемы адсутнасці літаратуры на беларускай мове для ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі. Для забеспячэння насельніцтва БССР, яно павінна было выпускаць літаратуру у адпаведнасці з іх нацыянальнымі патрэбамі ў наступных працэнтных адносінах: беларускай – 70 %, яўрэйскай – 15 %, польскай – 5 %, латышскай і літоўскай – 2 % [3, ф.18, воп. 1, спр. 246, л. 55].

Партыйнае кіраўніцтва выдавецкай справай ажыццяўлялася з дапамогай адпаведных органаў. Спачатку гэта былі пададдзелы друку агітпропаў партыйных камітэтаў. Яны збіралі звесткі аб становішчы газет і выдавецтваў, займаліся кадравымі пытаннямі. Потым быў распрацаваны агульнасаюзны праект, які прадугледжваў арганізацыю самастойных аддзелаў друку пры ўсіх нацыянальных ЦК, абласных бюро ЦК, якія павінны былі назіраць за паслядоўным правядзеннем палітыкі партыі і ажыццяўляць кантроль, забяспечваць ідэалагічную вытрыманасць тэкстаў. Так, 15 ліпеня 1926 года сакратарыят ЦК зацвердзіў прапанову аддзела друку ЦК КП(б)Б аб «кіраўніцтве выдавецтвамі». У адпаведнасці з ёю ўсе выдавецтвы і выдавецкія ўстановы былі падзелены на дзве катэгорыі: выдавецтвы, на чале якіх стаяць камуністы, і прыватныя выдавецтвы, якія ўзначальваюць беспартыйныя [1, с. 80]. Кіраўніцтва першай групай выдавецтваў ажыццяўляў непасрэдна аддзел друку ЦК, другой – аддзел друку з дапамогай Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў, а таксама Выдавецкага камітэта пры аддзеле друку ЦК КП(б)Б. Дапаможнымі органамі аддзела друку ЦК КП(б)Б з'яўляліся розныя камісіі, якія стварaліся кожны год для зацвярджэння Бюро ЦК КП(б)Б напрамкаў выдавецкай палітыкі. Яны яшчэ раз (пасля Галоўліта і аддзела друку) больш уважліва фільтравалі рэдакцыйна-выдавецкія планы, разглядалі тэматыку і змест выдаваемых кніг, каб выявіць і прыняць пад увагу патрэбы насельніцтва ў друкаванай прадукцыі. Аднак трэба заўважыць, што на працягу другой паловы 1920-х гадоў дзейнасць усіх гэтых органаў была не вельмі актыўнай.

Пасля згортвання новай эканамічнай палітыкі, а з ёю і беларусізацыі, за дзяржавай замацавалася манапольнае права на выданне кніг і перыёдыкі, друкарні прыватна-ўласніцкага сектару, самастойныя кааператыўныя выдавецтвы перасталі існаваць. Канчаткова замацавалася цэнтралізацыя выдавецкай спра-

вы і канцэнтрацыя яе ў асноўных кнігавыдавецкіх прадпрыемствах рэспублікі, такіх як Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (БДВ), Інбелкульт і Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел ЦСПСБ (РВА ЦСПСБ) [1, с. 81]. Кожнае з іх спецыялізавалася па выпуску адпаведнай літаратуры. Інбелкульт выпускаў навукова-даследчыцкую літаратуру, падрыхтаваную інстытутамі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі рэспублікі, Беларускае дзяржаўнае выдавецтва – сацыяльна-палітычную, мастацкую, дзіцячую, партыйную, РВА ЦСПСБ забяспечваў неабходнай літаратурай прафесійныя арганізацыі Беларусі. Астатнія выдавецтвы падлягалі безумоўнай ліквідацыі. Аднак яшчэ пэўны час функцыянавалі выдавецкія аддзелы пры Народным камісарыяце юстыцыі, Народным камісарыяце па ахове здароўя, Дзяржплане БССР.

Дадзеная расстаноўка акцэнтаў у кнігавыдавецтве амаль не змянялася, выключэннем з’яўляўся РВА ЦСПСБ, які быў створаны 17 ліпеня 1925 года як самастойная юрыдычная адзінка на гаспадарчым разліку [3, ф. 17, воп. 1, спр. 8, л. 2]. Планавалася, што выдавецкая дзейнасць і распаўсюджванне сваёй літаратуры праз крамы, павінны былі базіравацца выключна на ўласных эканамічных магчымасцях. Але сама па сабе прадукцыя рэдакцыйна-выдавецкага аддзела не прыносіла прыбытку (распаўсюджванне прафлітаратуры яшчэ не набыло масавага характару і большая частка кніг уяўляла сабой «мёртвы» капітал). Таму асноўнай крыніцай сродкаў для выдавецкай і кнігагандлёвай дзейнасці выступаў гандаль дэфіцытнымі канцылярскімі таварамі. Гэта супярэчыла агульнадзяржаўнай гандлевай палітыцы і было прызнана недапушчальным. У выніку Камітэт па справах друку, які быў створаны ў снежні 1926 года і займаўся рэгуляваннем гаспадарчай дзейнасці ўсіх выдавецтваў, кантролем за функцыянаваннем паліграфічнах прадпрыемстваў БССР, прызнаў немэтазгоднасць далейшай дзейнасці Рэдакцыйна-выдавецкага аддзела і перадаў яго функцыі БДВ [3, ф. 17, воп. 1, спр. 8, л. 34].

Апошняе з’ўлялася найбольш буйным выдавецтвам у БССР, удзельная вага якога ў агульнай вытворчасці цэнзавай паліграфічнай прамысловасці за 1924 – 1925 гады складала 78 % [3, ф. 18, воп. 1, спр. 246, л. 55]. Беларускае дзяржаўнае выдавецтва дзейнічала на правах дзяржаўнага трэста на пачатках гаспадарчага разліку і ў адносінах унутранага распарадку карысталася пэўнай аўтаноміяй. Агульнае кіраўніцтва і кантроль за дзейнасцю выдавецтва (зацвярджэнне гадавых справаздач і планаў, прызначэнне і змена членаў праўлення) фармальна ажыццяўляў Наркамасветы, у сістэму якога ўваходзіла БДВ. Рэдакцыйна-выдавецкія планы зацвярджаліся спецыяльным аддзелам друку ЦК КП(б)Б, якому Белдзяржвыдавецтва падпарадкоўвалася ў ідэалагічных адносінах. Акрамя гэтага пры Белдзяржвыдавецтве існавала спецыяльная рэдакцыйная калегія, якая вырашала пытанне аб мэтазгоднасці выпуска той ці іншай кнігі [7, с. 229]. У яе склад уваходзілі М. Кудзелька, С. Некрашэвіч, І. Шыпіла, В. Сербента і іншыя [3, ф. 4, воп. 7, спр. 264, л. 28].

Пад уплывам грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных зменаў у жыцці грамадства ў пачатку 1930-х гадоў, а менавіта з фабрыкаваннем справы «Саюза вызвалення Беларусі» партыйны кантроль за друкам значна ўзмацніўся, а памяркоўная палітыка ў адносінах да кнігавыдавецкай справы была заменена рэпрэсіўнымі метадамі. Трэба адзначыць, што яшчэ ў 1928 годзе ў аддзел друку быў накіраваны ліст, нібыта падпісаны групай беларускіх мастакоў з абвінавачаннямі ў адрас кіраўніцтва Дзяржвыдавецтва – З. Жылуновіча (старшыня выдавецтва) і Я. Цвікевіча (узначальваў выдавецкі сектар). Сутнасць ліста заключалася ў тым, што названыя дзеячы быццам бы стрымлівалі ўжо пяты год буйны росквіт беларускай літаратуры і мастацтва, дэзарганізавалі мастакоў. Ян Цвікевіч называўся «злым геніям беларускага мастацтва і беларускай кнігі», а З. Жылуновіч быў ахарактарызаваны наступным чынам: «Сядзіць лысы каля дзяржаўнай місы, капялюш берлінскі, а характар свінскі» [3, ф. 4, воп. 16, спр. 69, л. 55]. Старшыня выдавецтва абвінавачваўся ў тым, што ён прыціскаў правы маладых пралетарскіх пісьменнікаў, аддаваў перавагу «славутым» творам Ц. Гартнага і гэтак далей. Высновы і прапановы «мастакоў» зводзіліся да наступнага: неабходна ператварыць выдавецтва ў студыю, дзе б ідэалагічна і прафесійна выхоўваліся беларускія мастацкія сілы, патрэбныя для сацыялістычнага будаўніцтва, а на чале б стаялі людзі абсалютна нейтральныя, вытрыманыя і дысцыплінаваныя партыйцы, якія былі толькі б адміністратарамі [3, ф. 4, воп. 16, спр. 69, л. 56]. Гэта быў «вельмі сваечасовы» ліст, па якім пачалі праводзіць расследаванне, якое ў сваю чаргу дало пэўныя вынікі.

У кастрычніку 1930 года Беларускае дзяржаўнае выдавецтва падверглася інтэнсіўным праверкам з боку Наркамата Рабоча-сялянскай інспекцыі. Гэтаму папярэднічала негатыўная характарыстыка выдавецкай прадукцыі БДВ Галоўлібелам пад час справаздачы перад Бюро ЦККП(б)Б. Па выніках праверак дзейнасць выдавецтва была прызнана нездавальняючай і права-апартуністскай, а друкуемая прадукцыя была аднесена да палітычна-шкоднай, нацдэмаўскай літаратуры («Западнорусизм» А. Цвікевіча, «Падарожжа на новую зямлю» М. Зарэцкага, вершы У. Дубоўкі і Т. Кляшторнага і іншае). Да твораў з ярка выяўленай антыпралетарскай ідэалогіяй былі аднесены кнігі, дзе вялася прапаганда прышчэпаўскай зямельнай палітыкі або як, напрыклад, у падручніку геаграфіі А. Смоліча прыводзілася з пункта гледжання савецкіх і партыйных органаў крамольная думка аб тым, што Беларусь была акупавана не толькі з боку Польшчы,

але і Расіі. Наогул, дадзеная кніга была ахарактарызавана, як невытрыманая з погляду марксістскай ідэалогіі і насычыная нацыяналістычнымі развагаваннямі [3, ф. 4, воп. 3, спр. 6, л. 18]. Такая ацэнка была характэрна амаль для ўсёй друкаванай прадукцыі, выдадзенай да 1931 года.

Акрамя абвінавачання Белдзяржвыдавецтва ў тым, што яно ў сваёй дзейнасці адарвалася ад пралетарскай грамадскасці, не ўдзельнічала ў папулярызацыі сацыялістычнай прамысловасці і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР, а таксама ў палітычным выхаванні насельніцтва, у віну было пастаўлена тое, што кіраўнікі выдавецтва мала ўвагі ўдзялялі выпуску марксістска-ленінскай літаратуры і не выконвалі дырэктывы аб выданні масавай, сельскагаспадарчай і іншай літаратуры для абслугоўвання нацыянальных меншасцей [8, ф. 24, воп. 1, спр. 616, л. 73]. За пяць гадоў (1925 – 1930) было выпушчана толькі некалькі кніг па гэтай тэматыцы: «Гістарычны матэрыялізм», «Шлях да сацыялізма» М. Бухарына і «Аб Леніне і ленінізме» І. Сталіна [3, ф. 4, воп. 3, спр. 38, л. 1004]. Па меркаванню партыйных органаў гэта было вынікам гуртавання вакол БДВ пераважна нацдэмаўскіх, контррэвалюцыйных кадраў (Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, З. Жылуновіч). Таму першае дзесяцігоддзе дзейнасці Белдзяржвыдавецтва (1921 – 1931), калі вакол яго групіраваўся цвет беларускай інтэлігенцыі, калі ва ўмовах беларусізацыі колькасць беларускамоўнай літаратуры адпаведнага зместу значна павялічылася, было аддана анафеме. Галоўнай віной было імкненне выдаваць літаратуру, якая на погляд работнікаў выдавецтва больш адпавядала беларускаму народу, выхоўвала пачуццё годнасці, індывідуальнасці, любові да сваёй радзімы. Кіраўніцтва Белдзяржвыдавецтва і разам з ім большая частка аўтарскага складу, былі аднесены да ворагаў народа, пад уплывам якіх з органа выхавання выдавецтва быццам ператварылася ў «злачное» месца [3, ф. 4, воп. 16, спр. 111, л. 53]. У выніку пасля змены амаль цалкам кадравага складу, змянілася накіраванасць і змястоўнасць галоўнага выдавецтва краіны.

З мэтай аздараўлення і выпраўлення становішча СНК БССР пастанавіў, што БДВ «павінна цесна звязваць свае выдавецкія планы з агульным развіццём сацыялістычнай гаспадаркі з тым, каб прадукцыя адлюстроўвала пытанні класавага змагання і правільнага вырашэння нацыянальнай палітыкі, шырока асвятляла і папулярызавала праблему індустрыялізацыі БССР, рост і павелічэнне адноснай вагі прамысловасці ў гаспадарцы, папулярызавала нябывалы творчы ўздым у выкананні прамфінплану і сустрэчных прамфінпланаў метадам сацыялістычных спаборніцтваў і ўдарніцтва, арыентавала савецкую грамадскасць і працоўнае сялянства на далейшае развіццё саўгасна-калгаснага будаўніцтва» [8, ф. 24, воп. 1, спр. 616, л. 73]. Белдзяржвыдавецтва павінна было пераглядзець сваю дзейнасць і перабудавацца ў адпаведнасці з пастановамі СНК. Трэба было падрыхтаваць новыя кадры. Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел, каб забяспечыць пэўны нагляд за кожнай галінай літаратуры, быў разбіты на сектары, на чале якіх стаялі адказныя рэдактары. Пад пільным наглядам з боку партыйных органаў адбывалася так званая «дэмакратызацыя» выдавецкай справы. Была распачата арганізацыя спецыяльнага працоўнага рэдакцыйнага савету пры БДВ, які павінен быў звязаць выдавецкую дзейнасць з рабочымі буйных прадпрыемстваў, устанавіць непасрэдны кантроль над выдавецкай дзейнасцю і «дапамагчы выхаванню непасрэдных рэдакцыйных работнікаў з рабочых». З мэтай кантролю і выпраўлення рэдакцыйна-выдавецкіх планаў пачало практыкавацца абгрунтаванне апошніх на сходах рабочых, пісьменнікаў, настаўнікаў, камандуючага складу і чырвонаармейцаў [3, ф. 1, воп. 3, воп. 38, л. 277].

На працягу красавіка 1933 г. адбылася чыстка кніга-гандлёвага апарату як у цэнтры, так і на перыферыі ад «класава чуждых, антысавецкіх, нацыяналістычных элементаў». Цалкам быў абноўлены кіруючы склад БДВ (100 % камуністы), на 60 % – аўтарскі склад, на 70 % – рэдакцыйна-тэхнічны апарат [3, ф. 1, воп. 3, воп. 38, л. 273 – 274]. Каб палегчыць кантроль з боку партыйных органаў за зместам выдаваемай літаратуры ў першай палове 1930-х гадоў была прадпрынята спроба стварыць сістэму спецыялізаваных выдавецтваў. Адбылася рэарганізацыя Беларускага дзяржаўнага выдавецтва. У 1931 годзе з яго быў выдзелены сектар тэхнічнай літаратуры, які ператварыўся ў самастойнае дзяржаўнае выдавецтва, з непасрэдным падпарадкаваннем ВСНГ [3, ф. 4, воп. 3, спр. 42, л. 799]. Яно павінна было займацца выданнем масавай тэхнічнай літаратуры, спецыялізаванай літаратуры для адміністрацыйна-тэхнічных кадраў прамысловасці і выдаваць падручнікі для індустрыяльных тэхнікумаў, ВНТУ. Праз некаторы час ў складзе БДВ былі створаны аддзелы па наступных галінах кніжнай прадукцыі: партыйнай і паліт-масавай літаратуры, вучэбнай і педагагічнай, сельскагаспадарчай, мастацкай, дзіцячай і юнацкай, вайсковай, якія, у сваю чаргу, ператварыліся ў самастойныя выдавецтввы. У 1932 годзе на аснове аддзела ваеннай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР было арганізавана Ваеннае выдавецтва (у 1934 годзе працавала як Выдавецтва Беларускай ваеннай акругі, спыніла дзейнасць у 1935 у сувязі са стварэннем сектара ваенна-абароннай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР [3, ф. 4, воп. 8, спр. 48, л. 10]. У 1932 годзе адноўлена Партыйнае выдавецтва ЦК КП(б)Б (дзейнічала да 1938).

Аднак спецыялізаваныя выдавецтвы не здолелі існаваць самастойна. Ужо ў 1933 годзе адбылося аб’яднанне дзяржаўных выдавецтваў (БАДВ) шляхам уключэння на аўтаномных пачатках усіх тага-

часных выдавецтваў, такіх як вайсковае, навукова-тэхнічнае, партыйнае і Беларускае дзяржаўнае выдавецтва як гаспадарча-разліковыя адзінкі [3, ф. 4, воп. 8, спр. 155, л. 9]. Адбылося гэта з-за таго, што з самага пачатку не былі створаны ўмовы для самастойнага існавання спецыялізаваных выдавецтваў, не быў вывучаны спажывецкі рынак. Быў проста выкананы загад з цэнтру, без уліку асблівасцей краіны. Выдавецтвы не мелі адпаведнай матэрыяльнай базы, не былі ўкамплектаваны кваліфікаванымі кадрамі. Яны як навукова-тэхнічнае выдавецтва з самага пачатку не арыентаваліся на арыгінальную масавaю папулярную літаратуру, а займаліся перакладам рускамоўных кніг па спецыяльнасцях (што павышала сабекошт друкаванай прадукцыі). Каб выканаць абавязковы план, павышалі тыраж, выпускалі недабраякасную прадукцыю. Галоўным прынцыпам стала перавага колькасці над якасцю. Такая палітыка прывяла да стратнасці выдавецтваў, а віну зноў усклалі на кіраўніцтва.

У 1935 – 1937 гадах хваля рэпрэсій закранула сферу кнігавыдавецкай дзейнасці. Толькі за 1935 год і шэсць месяцаў 1936 году было вызвалена ад займаемых пасад 92 супрацоўніка Белдзяржвыдавецтва [7, с. 240]. На гэты раз асноўнымі матывамі для звальнення акрамя контррэвалюцыйнай дзейнасці было палітычнае мінулае і сваяцтва з ворагамі народа. Так, была зволена дачка вядомага беларускага гісторыка, філолага і этнографа В. Ластоўскага, які ў савецкі час атаесамляўся з «нацыянал-фашызмам» [3, ф. 4, воп. 16, спр. 111, л. 58]. Толькі кіруючых работнікаў не хапала каля 70 чалавек, не было дырэктара выдавецтва, загадчыкаў сектарамі (сектар мастацкай, сацыяльна-эканамічнай літаратуры), упаўнаважанага Галоўліта, рэдактараў [9, с. 126]. Як вынік, узнікла вострая патрэба ў кваліфікаваных работніках, але цяжкасць заключалася ў тым, што пасля шматлікіх чыстак, ганенняў вакантныя пасады газетна-выдавецкага сектара не было кім запоўніць. Калі раней ЦК КП(б)Б вырашала кадравае пытанне шляхам перамяшчэння работнікаў і прасоўваннем слаба падрыхтаваных на кіруючыя пасады, то цяпер і гэта стала немагчыма, бо патрабавалася адразу вялікая колькасць людзей. Аднак справа была не столькі ў недахопе адпаведных людзей у межах Беларусі, колькі ў тым, што ніхто не хацеў ісці, асабліва на адказныя пасады. У верасні 1936 году на Бюро ЦК КП(б)Б на пасаду намесніка дырэктара ДВБ быў высунуты для зацвярджэння І. Раманчук, які дагэтуль працаваў дырэктарам Музея Рэвалюцыі [3, ф. 4, воп. 3, спр. 357, л. 80]. Каб пазбегнуць небяспечнага прызначэння, ён спасылаўся на стан здароўя, у першую чаргу на слабую нервовую сістэму. Таму, каб вырашыць кадравае пытанне, ЦК УКП(б) пасля адпаведнай просьбы сакратара ЦК КП(б)Б М. Гікала камандзіраваў у БССР 20 кваліфікаваных работнікаў друку [9, с. 125 – 126]. Такое вырашэнне кадравай праблемы, прывяло да ўкамплектавання газетна-выдавецкага сектара людзьмі, якія актыўна праводзілі афіцыйную лінію і паступова выкаранялі з беларускай культуры ўсе праявы нацыянальнага.

На працягу 1930-х гадоў усе пытанні, звязаныя з выдавецкай дзейнасцю, кантролем над ёю вырашаліся ў розных кабінетах ЦК КП(б)Б і канчаткова зацвярджаліся вышэйшымі партыйнымі органамі. Каб пазбегнуць пранікнення «варожай» літаратуры на пачатковым узроўні аддзел друку і выдавецтваў ЦК КП(б)Б прадстаўляў на зацвярджэнне Бюро ЦК КП(б)Б тэматычна-выдавецкія планы як ДВБ, так і астатніх выдавецтваў [3, ф. 4, воп. 3, спр. 387, л. 7]. Яны ўзгадняліся з прадстаўнікамі зацікаўленых арганізацый (Наркамасветы, Наркамзем, аддзелы школ). Акрамя гэтага, аддзел друку і выдавецтваў прадстаўляў Бюро спіскі выдадзенай літаратуры на мовах нацыянальных меншасцей з улікам звестак аб аўтарах і становішчы на літаратурным рынку. Менавіта ён прапанаваў разгледзець пытанне аб спыненні выдання польскамоўнай літаратуры, таму што кадры польскіх паэтаў і пісьменнікаў БССР былі нязначнымі і па палітычных меркаваннях ненадзейнымі.

З 1936 году значна павялічылася колькасць выданняў на рускай мове. Гэта было звязана з палітыкай атаесамлення паняццяў «савецкі» і «рускі». Так, у 1936 годзе ў газеце «Правда» сцвярджалася, што «ненависть к русскому народу включает в себя, конечно, ненависть ко всему советскому в целом» [7, с. 334]. Таму БДВ, якое спецыялізавалася пераважна на выдавецтве беларускамоўнай літаратуры, было абвінавачана ў тым, што яно ўшчамляе правы рускага насельніцтва. Згодна з рашэннем ЦК КП(б)Б Беларускае дзяржаўнае выдавецтва было перайменавана ў Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, тым самым сціраўся яго нацыянальны характар. З таго часу назіраліся значныя перамены ў яго дзейнасці: скараціўся аб'ём выдання арыгінальных твораў беларускіх аўтараў за кошт павелічэння колькасці рускіх. Цікава, што пры гэтым удзельная вага беларускамоўных кніг па-ранейшаму павялічвалася, але цяпер за кошт перакладаў. Такая дэманстратыўнасць супрацьпастаўлялася рэжыму Ю. Пілсудскага ў Заходняй Беларусі і стварала спрыяльную глебу для цягі яе насельніцтва да Савецкай Беларусі. Адначасова ўзмацніўся кантроль з боку партыйных органаў, які стаў разглядацца як фактар аздараўлення кнігавыдавецтва БССР.

У 1938 годзе было распрацавана новае палажэнне аб падпарадкаванні Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, згодна з якім яно перайшло ад Наркамасветы ў сістэму СНК БССР [10]. Галоўнай мэтай дзейнасці выдавецтва станавілася «палітычнае выхаванне, вытворча-тэхнічная і агранамічная асвета шырокага кола насельніцтва праз друк і распаўсюджванне палітычнай, сацыяльна-гістарычнай, мастацкай і

іншай літаратуры» на рускай, беларускай і яўрэйскай мовах. Узначальваў выдавецтва дырэктар і два яго намеснікі, якія прызначаліся СНК БССР. Што датычыць структуры, то ў складзе ДВБ былі арганізаваны аддзелы, якія адказвалі за вытворчы і фінансавы бакі выдавецкай справы, і рэдакцыі па адпаведным галінам літаратуры. Апошнія распрацоўвалі тэматычныя планы, ажыццяўлялі рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку рукапісаў, забяспечвалі выданне літаратуры згодна з зацверджанным планам. Супрацоўнікі рэдакцый складалі анатацыі на новыя выданні, падтрымлівалі трывалую сувязь з Саюзамі пісьменнікаў БССР і іншых рэспублік, прыцягвалі новыя аўтарскія кадры. Была ўведзена пасада інспектара па кадрам, які займаўся арганізацыяй тэхнічнай вучобы і перыядычных курсаў перападрыхтоўкі для выдавецтва і яго аддзяленняў на перыфірыі, а таксама вёў улік і падбор кадраў.

Такім чынам, мадэль кнігавыдавецкай сістэмы, якая выкрышталізавалася ў другой палове 1920 – 1930 гадоў, цалкам адпавядала запатрабаванням урадавай палітыкі. Развіццё выдавецкай справы з канца 20-х гадоў у БССР адбывалася толькі на базе дзяржаўнага сектара. Ва ўмовах складання таталітарнай сістэмы існаванне іншых форм было немагчыма, прыватныя выдавецтвы былі прызнаны варожымі і выцеснены на доўгі час. З узмацненнем рэжыма манаполія дзяржавы на выданне кніг і перыёдыкі стала непарушнай. Уся друкаваная прадукцыя цалкам кантралявалася спецыяльна створанымі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі. Перыядычны і неперыядычны друк стаў магутным інструментам рэалізацыі памкненняў улады.

## ЛІТАРАТУРА


1. Волк А.А., Ракович А.И. Книгоиздательское дело в Белоруссии. – Мн.: БГУ, 1977.
2. Głogowska H. Białoruś 1914 – 1929. Kultura pod presją polityki. – Białystok, 1996.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1. Воп. 3; Ф. 4. Воп. 3, 7, 8, 16; Ф. 17. Воп. 1; Ф. 18. Воп. 1.; Ф. 63. Воп. 1.; Ф. 42. Воп. 1.; Ф. 238. Воп. 1.
4. Волк А.А., Раковіч А.І. Беларускае кнігадрукаванне за гады савецкай улады // 450 год беларускага кнігадрукавання. – Мн., 1968.
5. Подгорнова А.И. Советское книгоиздательство в 20-е годы. – М.: Наука, 1984.
6. Блюм А.В. За кулисами «Министерство правды»: тайная история советской цензуры (1917 – 1929 гг.). – СПб.: Академический проект, 1994.
7. Протько Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917 – 1941 гг.). – Мн.: Тесей, 2002.
8. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. Ф. 24. Воп. 1.
9. Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 2000.
10. СЗ БССР. – Мн., 1938. № 18. Арт. 71.